берасцейскімі дзеячамі РНСіМА, апынуўся ў звычайным россыпу папераў, якія датычыліся дзейнасці агранамічнай структуры ГУЗіЗ.


**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гродна. Ф. 868. В. 2. Спр. 4.
2. www/ru.m.wikipedia.org/wiki/.


УДК 357. 23 (091) "1914" (476.76)

# У РАМКАХ ЗМАГАННЯ З «БЕЗРАБОЦЦЕМ»: МУЗЕЙНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА ГАРАДЗЕНСКАГА ГУБЕРНСКАГА АГРАНОМА ПАЎЛА МІНКОВА Ў 1914 Г.


**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь


Пачатак Першай сусветнай вайны стаў апошнім этапам дзейнасці структур дзяржаўнай сельскагаспадарчай дапамогі, якая ў Гарадзенскай губерні набыла сталы характар з канца першага дзесяцігоддзя XX ст. Размяшчэнне губерні непадалёк ад тэатра вайсковых дзеянняў, прызыў у армію сялян і супрацоўнікаў структур, якія аказвалі сельскагаспадарчую дапамогу, а таксама скарачэнне фінансавання адбіваліся на працы гарадзенскіх аграномаў. Сітуацыя, аднак, не ўсім падавалася безнадзейнай, а аграномы-супрацоўнікі ГУЗіЗ па губерні нават знаходзілі магчымасць апраўдаць сваё ўтрыманне дзякуючы навукова-культурным ініцыятывам.

Адна з іх была зафіксавана ў "цыркулярным" звароце ад 28 жніўня 1914 г. гарадзенскага губернскага агранома Паўла Мінкова да ўсіх *"Аграномаў і Інструктараў па асобным накірункам Гарадзенскай Губерні"*. Гэты дакумент захаваўся ў архіве Гарадзенскай асаблівай агранамічнай нарады [1, арк. 42-42 адв.].

На пачатку свайго паслання П. Мінкоў даволі шчыра канстатаваў, што *"на гэты час, насуперак таму, што кажуць, наша праца зведзена да мінімуму і з'яўляецца хутчэй паўпрацай, чым працай у поўным сэнсе гэтага слова"*. Тым не менш, разумеючы рэальнасць бягучых падзей, губернскі агроном бачыў магчымасць знайсці карысны эфект ад існавання агранамічнага персаналу і, такім чынам, уберагчыся ад абвінавачанняў у *"гультайстве"*. Альтэрнатыву агранамічнай дапамогі П. Мінкоў уяўляў наступным чынам: на яго думку, наступіў той самы зручны момант, каб *"заняцца збіральніцтвам усяго таго, што можа стаць такім неабходным для нас, аграномаў, а ўласна заняцца вывучэннем нашай губерні як з пункту гледжання натуральнай*

*гісторыі, так і ў прыватнасці з пункту гледжання аграномічнага (у шырокім сэнсе гэтага слова)"* [1, арк. 42].

П. Мінкоў адзначыў, што яго намаганнямі быў дадзены пачатак існавання двух аграномічных кабінетаў у Гародні і Кобрыне, а М. Лазоўскім – у Саколцы. Аднак ініцыятыва П. Мінкова не знайшла шырокай падтрымкі *"да сораму нас усіх аграномаў"*. Увесь удзел аграномічнага персаналу быў зведзены да прадстаўлення А. Васінчуком некалькіх узораў авечай поўсці, Б. Казачэнкам – калекцыі жыта, *"атрыманай пры рознай яго культуры", П. Акішавым – "цікавай калекцыі інсектыцыдаў і фунгіцыдаў"* [1, арк. 42]. Тым не менш, П. Мінкоў быў вельмі ўдзячны калегам-аграномам і за гэта, але палічыў патрэбным нагадаць, што ніякай работы аграномы і інструктары па асобных напрамках не зрабілі, у выніку апынуліся па-за ўвагай *"геалогія, глебазнаўства, сортазнаўства, саматужныя промыслы і г. д., і г. д."*. Між тым губернскі аграном выказаў вельмі аптымістычную надзею на тое, што праз некаторы час у *"Гародні можа адчыніцца гістарычны і прыродазнаўчы музей"* [1, арк. 42-42 адв.]. Свае словы П. Мінкоў пацвярджаў інфармацыяй аб тым, што ён размаўляў з губернатарам адносна магчымасці заснавання музея. Больш таго, П. Мінкоў адкрыта сцвярджаў, што губернатар *"сур'ёзна аб гэтым думае, прычым нават існуе праект аб вылучэнні адпаведнага памяшкання"* [1, арк. 42-42 адв.].

Затрымка ў рэалізацыі адпаведнага праекта была абумоўлена *"выключна існуючымі палітычнымі ўскладненнямі"*, якія П. Мінкоў ацэньваў як часовае становішча. Губернскі аграном апасаўся толькі таго, што ў выпадку прыняцця рашэння аб стварэнні музея, не будзе дастатковай колькасці экспанатаў. Каб прастымуляваць працу падначаленых у гэтым накірунку губернскі аграном звярнуўся да іх сораму і прафесійнага гонару: *"я не магу не звярнуць увагу на той канфуз, які мы ўсе павінны будзем знесці, калі думка аб заснаванні музея ажыццявіцца (а гэта, веру, будзе хутка) і ад нас, аграномаў, якія працуюць у губерні ўжо чацверты год, запатрабуюць экспанаты, якія адносяцца да той сферы, у якой мы працуем, і не думаю, каб асобы, якія шануюць сваю карпарацыю, спакойна перажылі гэтую ганьбу"* [1, арк. 42 адв.].

Жнівенскі 1914 г. зварот да аграномічнага персанала губерні па справе прыродазнаўчага музея П. Мінкоў назваў "апошнім". У ім яшчэ раз нагадвалася, што вольнага часу для збору экспанатаў было больш чым дастаткова. Акрамя таго, той, хто дачытаў да канца просьбу губернскага агранома, мог даведацца, што на ажыццяўленне гэтай працы меліся *"нязначныя сродкі"*, каб кампенсаваць фактычныя выдаткі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Камплементарная ацэнка ініцыятыў П. Мінкова па стварэнні ці напаўненні экспанатамі прыродазнаўчага музея ў Гарадзенскай губерні, несумненна, дапушчальная, калі сапраўдным яго матывам быў клопат пра навуку, захаванне прыроднай спадчыны і пашырэнне сельскагаспадарчых ведаў. Пэўныя сумненні ў гэтым выклікае жаданне П. Мінкова прадставіць дзейнасць па фармаванні музея не толькі як вынік яго асабістых высокіх памкненняў, але і як інспірацыю з боку кіраўніцтва губерні. Фінальная частка звароту П. Мінкова ўвогуле прагучала нетыпова для тагачаснага кіраўніка: ён падкрэслена дэкляраваў нежаданне ўзвышацца над сваімі падначаленымі, нават прапаноўваў лічыць сябе проста *“старэйшым па калегіі таварышам”,* а *“не проста “Губернскім Аграномам”*. Не зразумела, чым была выклікана такая чыноўніцкая лірыка, але яна відавочна сведчыла пра спецыфіку атмасферы адносін, якія імкнуўся культываваць у падначаленай яму структуры губеранскі агараном П. Мінкоў [1, арк. 42 адв.].

Па ўсёй верагоднасці, ініцыятыва губернскага агранома па стварэнні прыродазнаўчага музея ў Гародні сапраўды мела свой працяг. Прынамсі, пра гэта сведчаць звесткі пра існаванне ў 1915 г. у доме Ястржэмбскага ў раёне сучаснай плошчы Тызенгаўза “сельскагаспадарчага музея ўрадавай агранамічнай арганізацыі” [2, с. 350]. Не выключана, што гэта менавіта тая ўстанова, якую так жадаў убачыць у Гародні Павел Мінкоў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ. Ф. 868. В.1. Спр.6.
2. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. Гародня-Warszawa, 2012.

УДК 357. 23 (091) “1911/1912” (476.76)

## СПРОБА СТВАРЭННЯ ПЕРШАГА АГРАНАМІЧНАГА ВЫДАННЯ Ў ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Калі сыходзіць з захаваных архіўных матэрыялаў, Гарадзенская асаблівая агранамічная нарада (далей – ГААН) пачала сваю дзейнасць у 1910 г. і адразу стала важным інструментам рэалізацыі дзяржаўнай сельскагаспадарчай палітыкі. Дзейнасць ГААН мела рэгулярны характар, што даволі добра адлюстравана ў пратакольных журналах, якія вяліся на яе пасяджэннях. Аўтарытэт апошніх быў гарантаваны прысутнасцю і старшынствам губернатара, удзелам віцэ-губернатара



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ